Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і аблвыканкома.

Год выдання другі.

№ 70 (139)
АЎТОРАК
26
САКАВІКА
1940 г.

Цана 10 капеек

У абстаноўцы найвялікшага палітычнага ўздыму прайшлі 24 сакавіка выбары ў Вярхоўныя Советы СССР і БССР

ДЭМАНСТРАЦЫЯ ЛЮБВІ І АДДАНАСЦІ РАДЗІМЕ, ПАРТЫІ, ВЯЛІКАМУ СТАЛІНУ

Дзень 24 сакавіка 1940 года ўвойдзе ў гісторыю вызваленых народаў заходніх абласцей БССР як самая яркая старонка. У гэты дзень мільёны новых совецкіх грамадзян прадэманстравалі сваю любоў да сваёй радзімы, да партыі большэвікоў, да свайго вызваліцеля любімага Сталіна. Як яркі сонечны дзень ад цёмнай асенняй ночы, так адрозніваліся выбары ў вярхоўныя органы совецкай улады ад «выбараў», якія праводзіліся ў былой Польшчы. 24 сакавіка 1940 года было сапраўднае свята. Цэлыя сем'і, апранутыя па-святочнаму, ішлі на выбарчыя ўчасткі. На іх тварах была радасць і вяселле. Бо першы-ж раз у жыцці яны свабодна маглі выразіць сваё пачуцці. Яны ўпершыню апушчалі бюлетэні за сапраўдных прадстаўнікоў народа.

Сёння яшчэ няма канчатковых даных па выбарчых акругах. Але кожны наглядальнік, будучы ў гэты дзень на любым выбарчым участку — ці ў горадзе, ці ў вёсцы — мог убачыць малюнак, які ніколі не мог нават і прысніцца масціцкім, бекам і іншым панам. Гэтым панам на апошніх выбарах у сейм прышлося мабілізаваць усю паліцыю, армію шпікаў і здраднікаў з ППС і Бунда, і то ім удалося дабіцца яўкі менш паловы выбаршчыкаў да выбарчых урнаў. А 24 сакавіка 1940 года за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных больш 90 процантаў выбаршчыкаў выканалі свой грамадзянскі абавязак да 12—14 гадзін дня.

На радзе выбарчых участкаў мы мелі небывалую актыўнасць усёй масы выбаршчыкаў. Напрыклад, сяляне вёскі Хорашча, Беластоцкага раёна, усе, як адзін, з'явіліся на свой выбарчы ўчастак і прагаласавалі да 8 гадзін раніцы. На Букштэльскім участку гэтага-ж раёна ўсе 100 процантаў выбаршчыкаў прагаласавалі да 11 гадзін 30 мінут дня. На Рэгініцкім выбарчым участку Ломжынскага раёна за першыя дзве гадзіны галасавання выканалі свой грамадзянскі доўг 80 процантаў выбаршчыкаў, а да 12 гадзін дня — усе 100 процантаў выбаршчыкаў. Такіх фактаў можна было-б прывесці мноства.

Пасля гэтага ўсялякім хлусам з замежных агенцтваў, як Гавас і яму падобныя, нічога больш не астаецца рабіць, як толькі хлусіць. Гэтыя агенцтвы ў дзень выбараў распаўсюджвалі па радыё небыліцы, што нібыта недзе нехта прымушаў выбаршчыкаў, асабліва палякаў, з'явіцца да выбарчых урнаў. Кожны працоўны, будзе ён паляк, беларус ці яўрэй, пачуўшы гэтыя радыёвуткі, усміхнецца і скажа: «Так, хлусяць, як відаць, не ад добрага жыцця». А тав. Ян Думбкоўскі з Ломжынскага раёна, паляк па нацыянальнасці, які першы з'явіўся галасаваць на Багужыцкі выбарчы ўчастак, можа расказаць, як да 6 гадзін раніцы, гэта значыць да пачатку галасавання, 148 чалавек палякаў і беларусаў сабраліся да выбарчага ўчастка, і кожны хацеў першым апусціць бюлетэнь за кандыдатаў Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Кожны грамадзянін вызваленага края з нецярпеннем будзе чакаць канчатковых вынікаў галасавання. Гэтыя вынікі будуць радасныя і велічныя для ўсіх працоўных. Астаткі неразгромленых ворагаў народа яшчэ раз пераканаюцца ў сваім бяссіллі, у сваім адзіноцтве, у сваёй нікчэмнасці. Будзе над чым задумацца жыхарам парыжскіх гасцініц, панам бекам, падарэўскім і іншым заправілам з былой *польскай дзяржавы*. Неяк Падарэўскі, піяніст па спецыяльнасці, заявіў, што ён не сядзе за піяніна, пакуль не ўстаржаствуе польская дзяржава. Гэты стары праў. Не сядзець яму за піяпінам ніколі. Сядзець яму і яго калегам у парыжскіх атэлях і час ад часу цешыць сябе хлуснёй, якая выпараецца з душнай кухні агенцтва Гавас.

Вызвалены народ пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна ідзе сваім шляхам да шчасця. Ён выбраў сваіх прадстаўнікоў у вярхоўныя органы ўлады. І ніколі, ніколі не вернецца на вызваленую зямлю прыгнёт і насілле. Вызвалены народ пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна ідзе наперад дружнай сям'ёй да вяршынь чалавечага шчасця — да комунізма.

—«о»—

ДЗЕНЬ ВЫБАРАЎ У БЕЛАСТОКУ

ДЫХАННЕ ГІСТОРЫІ

Калі на вуліцах ілюмініраванага горада радыёрэпрадуктары адгрымелі «Інтэрнацыянал», у памяшканне 67 выбарчага ўчастка зайшла сям'я саматужніка Ануфрыева.

— Мо дапамагчы вам тут упрыгожваць? Мы кветкі прынеслі.

— Што вы, таварыш! — насустрэч расцвіў усмешкай малады старшыня выбарчай камісіі. — Даўно гатова ўсё як след. Дзякуем. За кветкі таксама дзякуем. Сядайце.

І агітатары гутарылі з сям'ёй да трох гадзін. У тры гадзіны на ўчастак пачалі з'яўляцца новыя выбаршчыкі.

У 5 гадзін праснуўся святочны Беласток. Вуліцы напоўніліся народам. Людзі спяшаліся на ўчасткі. Усюды гаварылі аб адным, радасным, хвалюючым, — аб выбарах роднай вярхоўнай улады.

На 45-м выбарчым участку, з якога вяла трансляцыю Маскоўская радыёстанцыя імені Комінтэрна, першым падышоў да стала выбарчай камісіі рабочы скурзавода Ігнат Бароўскі. Ён з гордасцю выняў совецкі пашпарт і, атрымаўшы бюлетэні, накіраваўся да урны. Закончыўшы галасаванне, ён падыходзіць да мікрафона. Голас Ігната Бароўскага слухала ўся совецкая краіна, увесь свет.

— Вызваленыя народы заходніх абласцей БССР пачынаюць галасаванне. У ясназорны Крэмль, у соцыялістычны парламент беларускай рэспублікі народ пасылае сваіх верных сыноў і дачок. Слава большэвіцкай партыі, слава правадыру Сталіну,— нашаму вызваліцелю і настаўніку — сказаў беластоцкі рабочы.

І мільёны рабочых, сялян, служачых — уся зямля вызваленага края з хваляваннем і трэпетам узяла ў рукі белыя і сінія лісткі. У лістках было шчасце людзей, іх лёс, іх радасць.

Спявала медзь аркестраў, грымела радыё:

В этот светлый день хрустальный,
Улыбающийся день,
Миллионы скажут: СТАЛИН,
Опуская бюллетень.

І мільёны белых і сініх лісткоў падалі ў урны. У бюлетэнях было сэрца народа, яго слова, яго сіла.

На 65-м выбарчым участку ў пакоі адпачынку, прагаласаваўшы, сядзела моладзь.

Дворнік Павел Трафімаў расказваў аб сваім жыцці.

— Душа цягне на чыгунку. Як запяе паравоз, маё сэрца і загуляе. А маю я 62 гадочкі. 14 год праездзіў на паяздах. Прышлі палякі, прагналі. Ідзі, кажуць, ты беларус. Паганая была шляхта. Помню, прымушалі галасаваць пры выбарах у сейм. А я схаваўся. Цэлыя суткі на падстрэшшы ляжаў. Так і не прагаласаваў. А цяпер, дзеткі... паспеў раней за вас! Совецкая ўлада гэта...

Тут дзед папярхнуўся махорачным дымам і замест слоў радасна патрос у паветры жылістым кулаком. Усе зразумелі, што гэта значыла.

На 76-м участку Совецкай выбарчай акругі выбаршчыкі гаварылі аб сваім кандыдаце ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай рэспублікі— Абраме Гешэлевічу Машэвіцкім.

Настаўнік Машэвіцкі 24 годы працуе ў школе. У дні панавання шляхты ён праўдзіва расказваў дзецям аб Совецкім Саюзе, аб жыцці, аб барацьбітах за долю працоўнага народа. Зараз на выбарчым участку сабраліся некаторыя выхаванцы старога настаўніка.

Шустрая, вясёлая Рыта Лерэс прапанавала:

— Давайце, спяём «Широка страна моя родная».

— Давайце, — падтрымалі другія.

А юнак, які два годы прасядзеў у гродненскіх казематах, прыпомніў:

— Абрам Гешэлевіч калісьці арганізоўваў летнія выезды ў лагеры. Там, у ціхіх лясах, мы развучвалі гэту песню. І — помніце — налядзелі паліцыянты?

Успамінаць прыемна, толькі няма з намі некаторых сяброў.

— Хаіма Гелера няма.

— ...і Словеса.

Хаім Гелер адзін з лепшых выхаванцаў настаўніка Машэвіцкага. Яго ведалі ў Заходняй Беларусі, як палкага, адважнага рэволюцыянера. 10 год трымалі Гелера ў сваёй катоўні дэфензіўшчыкі. Хаім Словес вымушан быў выехаць ва Францыю.

Без двух гэтых цудоўных юнакоў звініць на выбарчым участку песня:

Широка страна моя родная,
Много в ней полей, лесов и рек...

Дзесяткі жаночых і мужчынскіх галасоў маладых, пажылых і старых людзей высока ўзнімаюць песню аб знойдзенай радзіме:

Я другой такой страны не знаю,
Где так вольно дышит человек...

Гэта вясёлая песня гучыць над брукам беластоцкіх вуліц, па якіх мужна крочыць новая, сонечная гісторыя. Толькі 6 месяцаў таму назад тут стылі ў небе трубы пыльных і цесных ткацкіх і прадзільных фабрык. На вуліцах серабрыста бранчала шпорамі яснапагонная шляхта, і блукалі галодныя беспрацоўныя і жабракі.

Нават афіцыяльнае выданне «Даведачны каляндар па г. Беластоку» пісала аб жахах беластоцкага жыцця:

«Горад наш навадпілі жабракі... Заўважу хоць тое, што жабракі дрэнна харчуюцца. Жывуць у жахлівых брудных памяшканнях. Маючы бесперапынныя зносіны з надзвычайна бруднымі прадметамі, яны хутка падрываюць сваё здароўе. Часта пачынаюць хварэць сухотамі, стойкімі хваробамі воч і рознымі, падчас вельмі прыліпчывымі сыпамі...».

Тады ў гэтым горадзе гібеў бацька Абрама Машэвіцкага. Ён быў звычайным саматужнікам. Рабіў скураныя кашалькі і зусім не думаў аб тым, што яго сына будуць выбіраць у парламент.

Цяпер у Беластоку грыміць новая гісторыя. Восенню 1939 года яна грымела танкамі па гразкіх дарогах заняволеных беларускіх і ўкраінскіх заходніх зямель.

Яна чырвонаармейскаю зоркаю ўзышла над берагамі Заходняга Буга. Нібы навальніца, шуміць чырвоным сцягам над радзівілаўскімі замкамі.

І вось...

Галасуе совецкі Беласток. Лікуе вызвалены народ. Пяе медзь аркестраў. Песні, песні, песні.

То мы чуем дыханне Сталінскай гісторыі.

Анат. Вялюгін.

У Слабодскай выбарчай акрузе

У 12 гадзін ночы прышоў на 88 выбарчы ўчастак Іосіф Станіслававіч Прус, рабочы-тэкстыльшчык. Ён прасядзеў усю ноч на ўчастку і ў 6 гадзін раніцы першы апусціў выбарчы бюлетэнь у урну. Міхаіл Станіслававіч Юхневіч, дыспетчар чыгуначнага вузла, на вялікі свой жаль, «спазніўся». Ён прышоў на 88 участак у тры гадзіны ночы і таму ён галасаваў другім пасля тав. Пруса.

На 87 выбарчым участку к шасці гадзінам, калі старшыня паведаміў аб пачатку галасавання, было ўжо 30 чалавек выбаршчыкаў. Першай зайшла выбаршчыца т. Несвіжская.

— Гэта мой выбаршчык, — з гордасцю заяўляе агітатар тав. Рубінштэйн, — яна састаяла ў маім гуртку.

Агітатар тав. Усава можа таксама гардзіцца вынікамі сваёй работы. Кіруемы ёю гурток налічвае 51 чалавек. К 6 гадзінам раніцы 47 чалавек з гэтага гуртка ўжо выканалі свой грамадзянскі доўг. Не галасавалі яшчэ тры чалавекі, якія знаходзіліся на рабоце і адзін хворы.

На 84-м участку другім прагаласаваў 75-гадовы Абрам Каган. Рабочы тав. Эзровіч прышоў на ўчастак разам са сваім трохгадовым унукам.

— Няхай унук прыглядзіцца, — сказаў тав. Эзровіч, — як вызвалены народ радасна галасуе за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

На 86-м выбарчым участку муж і жонка Давід і Роза Байзер, атрымаўшы бюлетэні, увайшлі ў адну кабіну. Калі ім сказалі, што гэта забаронена, яны заявілі:

— Мы ўсё жыццё пражылі разам, дазвольце нам таксама разам прагаласаваць.

10 гадзін раніцы. Машыны, якія знаходзяцца ў распараджэнні выбарчых участкаў, едуць за прастарэлымі. Да хворых і вельмі прастарэлых ідуць члены выбарчай камісіі з урнай для галасавання.

Выбаршчыцы Райзлі Рабіновіч ужо 96 год. Члены выбарчай камісіі прышлі да яе з урнай і прапанавалі ёй галасаваць дома.

— Не, — адказала тав. Рабіновіч, — я пайду сама на ўчастак, я хачу сама наглядзець, як галасуе сёння вызвалены народ.

З асаблівым задавальненнем галасуюць грамадзяне, якія ўжо атрымалі совецкія пашпарты. У адказ на просьбу сакратара камісіі паказаць сваё пасведчанне асобы, яны з гордасцю паказваюць свой пашпарт — афіцыяльны дакумент, які аформіў іх маладое совецкае грамадзянства.

* * *

Слабодская выбарчая акруга налічвае каля 10 тысяч выбаршчыкаў. Да 10 гадзін раніцы 25 процантаў выбаршчыкаў аддалі ўжо свае галасы.

Усё больш і больш людзей уходзіць у прыветныя дзверы выбарчых участкаў. Прыходзяць цэлымі сем'ямі, суседзі з суседзямі, дзяўчаты з хлопцамі, старыкі, якіх вядзе пад руку сын ці ўнук.

К 12 гадзінам дня звыш 40 процантаў выбаршчыкаў акругі выканалі свой абавязак. К 14 гадзінам прагаласавала ўжо 67 проц. За гэтыя дзве гадзіны галасавала 2616 чалавек.

8 гадзін 15 мінут вечара. На 83 участку прагаласавалі ўсе 100 процантаў выбаршчыкаў. На астатніх участках за выключэннем адзінак усе выбаршчыкі прымалі ўдзел у галасаванні.

В. Бемаў.

ЗА ВЕРНЫХ СЫНОЎ РАДЗІМЫ

Ля асабняка былога фабрыканта Рыфкінда, дзе размясціўся 97 выбарчы ўчастак Фабрычнай акругі, у ноч з 23 на 24 сакавіка да самай раніцы не гаслі электрычныя агні.

На першым паверху члены ўчастковай камісіі заканчвалі апошнія падрыхтаванні. На другім паверху, не гледзячы на позні час, чуліся песні.

У гэтым асабняку не раз спраўлялі святкаванні. Але гэта былі зборышчы сытых людзей, якія жылі за кошт эксплаатацыі народа. Сёння тут будзе святкаваць народ. Ён будзе святкаваць сваё вызваленне ад рыфкіндаў, фуксаў і іншых міраедаў. Ён будзе святкаваць дзень выбараў сваіх прадстаўнікоў у Вярхоўныя органы совецкай улады.

На другім паверху жывуць курсанты. Яны рашылі галасаваць першымі, рашылі не спаць да раніцы. Пяюць вясёлыя і жыццерадасныя совецкія песні.

У 5 гадзін 45 мінут яны ўрачыста спушчаюцца ўніз на выбарчы ўчастак. Як-жа яны здзівіліся, калі ўбачылі пакоі, перапоўненыя народам. На ўчастак прышлі такія-ж, як і яны, выбаршчыкі, жадаючы прагаласаваць першымі.

На вуліцах незвычайна для такога ранняга часу ажыўлена. Радыёрэпрадуктары разносяць гукі любімай совецкай песні:

Широка страна моя родная...

Старшыня ўчастковай выбарчай камісіі тав. Пяцярэнка запрашае выбаршчыкаў прыступіць да галасавання.

Вось да стала падыходзіць работніца 1-га тэкстыльнага камбіната Сцепаніда Сеўко. Яна тут ужо з чатырох гадзін раніцы...

На выбарчы ўчастак прыходзяць усё новыя і новыя групы людзей. Выбаршчыкі вітаюць адзін другога з днём выбараў, па-сяброўску паціскаюць рукі.

Прагаласаваўшыя не разыходзяцца. На вуліцы паяўляецца духавы аркестр. У адным з пакояў другога паверха асабняка пачынаюцца танцы. Народ вясяліцца.

У 12 гадзіне ў суправаджэнні сваякоў прыходзіць 70-гадовы Іваноў. Ён зусім сляпы. Хвалюючыся, ён перадае старшыні выбарчай камісіі запіску. Вось яе тэкст:

— Я аддаю свой голас за верных сыноў нашай радзімы, за кандыдатаў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. Доўгія годы пражыў я пад гнётам польскага іга. Я нічога не бачу, а як жадаў-бы паглядзець усё радаснае, што творыцца зараз вакол мяне. Я дзякую Чырвонай Арміі і вялікаму Сталіну за вызваленне.

К вечару прыток людзей прыкметна памяншаецца. Асноўная маса выбаршчыкаў прагаласавала ўжо.

Ля ўвахода тоўпіцца група дзяцей. Ім цікава паглядзець усю ўрачыстасць, у якой праходзіць галасаванне. Затрымліваючы дарослых, дзеці звяртаюцца з просьбай:

— Дзядзька, з табой пайду, а? Я толькі пагляджу і зараз-жа выйду.

Да 11 гадзін ночы прагаласавалі ўсе выбаршчыкі гэтага ўчастка.

Н. Бражнікава.

У ЧЫРВОНАСЦЯЖНАЙ ЛЁГКАТАНКАВАЙ БРЫГАДЗЕ

У часцях 35-й ордэна Чырвонага Сцяга лёгкатанкавай брыгадзе з вялікім уздымам прайшлі мітынгі. У палкіх прамовах байцы, камандзіры і палітработнікі аднадушна заяўлялі, што яны з чэсцю адкажуць на высокую ўзнагароду, каторай совецкі ўрад адзначыў чырвоных воінаў, якія адзначыліся на фронце барацьбы з фінскай белагвардзейшчынай.

У рэзалюцыі, прынятай на мітынгу, гаворыцца:

«Заслухаўшы паведамленне аб узнагародзе нашай брыгады ордэнам Чырвонага Сцяга, мы, байцы, камандзіры і палітработнікі, выражаем удзячнасць нашаму ўраду, партыі, дарагому таварышу Сталіну. Нашы сэрцы напоўнены радасцю за тое, што мы атрымалі высокую ацэнку ад нашага ўрада. Мы горды тым, што ў нашых радах выпеставаны такія выдатныя воіны, як Героі Совецкага Саюза Дзідзенка, Крывой, Крысюк, Юрчанка і Дзяругін, якія самаадданна змагаліся за нашу радзіму, за вялікую справу Леніна—Сталіна. У адказ на высокую ўзнагароду мы клянёмся яшчэ лепш працаваць, мацаваць жалезную воінскую дысцыпліну і па першаму клічу нашай радзімы ісці выконваць любое заданне». (ТАСС).

ЛЕНІНГРАД—ВЫБАРГ

Выбарг, 25 сакавіка. (Спец. кар. ТАСС). Адкрыўся рэгулярны пасажырскі чыгуначны рух паміж Ленінградам і Выбаргам. Новы совецкі горад звязан зараз з Ленінградам па двух маршрутах. Адзін з іх праходзіць праз станцыі Белаостраў, Тэрыокі, Райбола, Перкіярві, а другі — уздоўж Фінскага заліва праз станцыі Белаостраў, Тэрыокі, Койвісто.

Учора да ўпрыгожанага флагамі Выбаргскага вакзала падышоў поезд № 63. Поезд спыняецца. На вагонах надпісы — Ленінград—Выбарг. На перон выходзяць пасажыры. Гэта група пагранічнікаў, чыгуначнікі, совецкія работнікі, якія прыехалі наладжваць у горадзе мірнае жыццё.

ДЗЕНЬ ВЫБАРАЎ У БЕЛАСТОКУ

НЕЗАБЫВАЕМЫ ДЗЕНЬ

(З блакнотам па выбарчых участках Чырвонаармейскай акругі)

ПЕРШЫЯ ВЫБАРШЧЫКІ

Яшчэ не прабіла і пяці гадзін раніцы, калі прыбіральшчыца камбіната № 4 Кацярына Францаўна Гняздоўская падышла да варот 41-га выбарчага ўчастка. Перашагнуўшы парог, яна ўвайшла ў светлы карыдор і спынілася ля самых дзвярэй.

— Здаецца, першая, — прашаптала Кацярына Францаўна, — нікому не ўважу сваёй чаргі.

У гэты момант адчыніліся дзверы ўчастка. Выбаршчыцу запрасілі ў прасторны прыгожы пакой.

— Чаго спыніліся ў калідоры? Заходзьце сюды, — сказаў член камісіі тав. Спіроў.

Тав. Гняздоўская зайшла ў пакой і пачырванела ад здзіўлення. Аказалася, што раней за яе на ўчастак ужо прышоў 80-гадовы Ісак Гершавіч Жэліковіч.

Да 5 гадзін 30 мінут прышло больш 20 чалавек. Сярод іх: М. С. Мілер з жонкай, С. А. Туровіч з цёткай, С. І. Сегін з жонкай, сястрой і пляменніцамі і іншыя.

...Хутка прышлі доўгачаканыя 6 гадзін. Звыш 50 выбаршчыкаў з увагай слухалі ўступныя словы старшыні ўчастковай выбарчай камісіі тав. Ваверняк:

— Таварышы выбаршчыкі! Зараз роўна 6 гадзін. Настаў той час, калі вызваленыя, новыя савецкія грамадзяне могуць прыступіць да свабодных, самых дэмакратычных у свеце выбараў. Запрашаю прыступіць да галасавання.

З радасным хваляваннем атрымліваюць выбаршчыкі першыя бюлетэні. За поўгадзіны на 41-м участку прагаласавала 55 чалавек.

* * *

На 42-м участку першай прагаласавала работніца трэста зялёных насаджэнняў тав. Шыманская. У ліку першых калектыўна прышлі 14 чыгуначнікаў. На 43-м участку да пяці гадзін прышлі грамадзяне Дабравольскі, Кавальскія, Чарляк і іншыя.

Найбольш многалюдна было на ўчастку № 48. Ля яго варот да шасці гадзін раніцы стварылася чарга ў 150 чалавек. Хатняя гаспадыня Ольга Іванаўна Данільчук з'явілася ў 5 гадзін. Амаль адначасова прышла 68-гадовая хатняя гаспадыня Ядвіга Фікус. Каму-ж першай галасаваць? Ледзь не паспрачаліся. Данільчук уступіла. Галасуючы першай, тав. Фікус сказала:

— Савецкія людзі — лепшыя людзі на свеце. Яны вызвалілі нас ад невыноснай кабалы, яны прынеслі нам шчасце. Вось чаму я галасую за старых і новых савецкіх грамадзян, за савецкую радзіму. Вось чаму я жадала прагаласаваць першай.

Да 7 гадзін 30 мінут на гэтым участку прагаласавала 274 чалавекі.

НАКАЗ УНУКА ВЫКАНАН

Старая выбаршчыца Міхаліна Казіміраўна Гусарава ў першай палове гэтага месяца атрымала пісьмо ад свайго ўнука — чырвонафлотца Ціхаакіянскага флота. Чырвонафлотец заклікаў сваю бабульку прыняць актыўны ўдзел у выбарах Вярхоўных Советаў СССР і БССР. Міхаліна Казіміраўна неадкладна паслала ўнуку адказнае пісьмо, у якім пісала:

«Дарагі Валодзя! З усёй шчырасцю прымаю твой заклік і наказ. Будзь упэўнен, што я першай пайду на выбарчы ўчастак і прагаласую за нашых лепшых прадстаўнікоў — за тт. Кавалёва, Турлейскага, Іванова, прагаласую за наша новае, шчаслівае жыццё, за вялікага Сталіна!

Наказ унука і сваё абяцанне М. К. Гусарава выканала. 24 сакавіка яна сапраўды першай прышла на выбарчы ўчастак № 44. Апускаючы ў урну бюлетэні, Міхаліна Казіміраўна радасна ўсміхнулася і прагаварыла:

— За новае, савецкае жыццё, за Сталіна! Няхай ведае ўнук, няхай ведаюць усе, што старая Гусарава прагаласавала за тое, каб савецкая ўлада асталася ў нас назаўсёды, прагаласавала за шчасце сваіх унукаў.

Гусаравай — 73 годы. Па нацыянальнасці — полька. Жыла выключна бедна. Хадзіла заўсёды смутнай, суседзям часта гаварыла:

— Нічога не выйдзе, трэба паміраць.

З прыходам Чырвонай Арміі Гусарава змянілася непазнавальна. Стала жыццерадаснай. Не гледзячы на свой узрост, у дні падрыхтоўкі да выбараў агітавала за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных.

Аб смерці, зразумела, Міхаліна Казіміраўна зараз не ўспамінае. Збіраецца ехаць у госці да ўнука і дачкі, якія жывуць у Савецкім Саюзе.

У ХВОРЫХ І ПРАСТАРЭЛЫХ

Настаў дзень выбараў. А хатняя гаспадыня Фёкла Маркаўна Хаманюк па-ранейшаму прыкавана да ложка.

— Як-жа будзе з галасаваннем?— сама сабе задавала пытанне хворая, — прыедуць з урнай на кватэру, ці не?

Мучыцельна праходзілі гадзіны. І калі Фёкла Маркаўна пачула ў дзвярах стук, адразу павесялела, абрадавалася.

Члены камісіі тт. Мішкоўскі і Васілюк прыбылі з урнай на кватэру. Хворая атрымала бюлетэні і была пакінута адна ў пакоі для тайнага галасавання. Дома прагаласавала, як і на ўчастку — па ўсіх правілах і законах.

Хворыя С. А. Радкевіч, Б. А. Матусяк і іншыя шчыра дзякавалі ўчастковай камісіі і савецкай уладзе за клопаты, за ўвагу. Вось што сказала пры галасаванні Браніслава Антонаўна Матусяк:

— Я хворая. Але ўсё-ж лічу сябе шчаслівай. Сваё гарачае жаданне — галасаваць за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных — я змагла ажыццявіць і дома. Прыношу вялікую ўдзячнасць участковай выбарчай камісіі.

Такія-ж любоўныя водгукі можна было чуць і ад прастарэлых грамадзян. Амаль усе яны адмаўляліся ад паездак на машыне. Прышоўшы на ўчастак пехатой, Марыя Васільеўна Іванова доўга не жадала ісці з участка.

— Савецкая ўлада ў мяне, — гаворыць Марыя Васільеўна, — даўно карыстаецца вялікім аўтарытэтам. Яна выхавала і вырасціла маіх чатырох сыноў, якія асталіся ў Савецкім Саюзе. Мне вельмі хацелася, каб такая ўлада была і ў нас, я ўсе 20 год малілася богу за хутчэйшы прыход да нас Чырвонай Арміі. А калі даведалася, што чырвонаармейцы перашлі польскую граніцу, усе дні пасціла, каб яны дайшлі да нас без афяр.

РАДАСНЫЯ ВЫНІКІ

Паток выбаршчыкаў на ўчастні павялічваўся з кожнай гадзінай.

На 41-м участку да 12 гадзін дня прагаласавала 32 процанты выбаршчыкаў, да 10 гадзін вечара — больш 90 процантаў.

Да 10 гадзін вечара на 43-м участку прагаласавала 96,5 процантаў выбаршчыкаў, на 42-м участку — 96,7 проц., на 44-м — 99,7 проц. выбаршчыкаў.

У ліку перадавых па Чырвонаармейскай акрузе аказаўся 44 участак. Да 11 гадзін ночы тут галасаванне закончана поўнасцю. Удзел у выбарах прынялі ўсе 100 процантаў выбаршчыкаў.

* * *

44 выбарчы ўчастак. 12 гадзін ночы. Старшыня ўчастковай выбарчай камісіі тав. Танклеўскі аб'яўляе, што выбары ў Вярхоўныя Саветы СССР і БССР закончаны. Зачыняюцца дзверы. У памяшканні ўчастка астаюцца толькі члены камісіі і ўпаўнаважаныя прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і друку.

Тав. Танклеўскі беражна знімае з урнаў сургуч, высыпае бюлетэні на шырокі, засланы сукном, стол. Намеснік старшыні тав. Сакалоў, сакратар тав. Грынглас, члены тт. Перальзон, Чарнецкая, Якубчык і іншыя пачынаюць падлічваць бюлетэні і галасы, паданыя за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных, за тав. Кавалёва ў Совет Саюза Вярхоўнага Совета СССР, за тав. Турлейскага — у Совет Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР, і тав. Іванова — у Вярхоўны Совет БССР.

Члены камісіі слова за словам з гордасцю гавораць:

— За!

— За!

— За!

Апавяшчаецца выяўлены на адным з бюлетэняў надпіс выбаршчыка:

— Я вельмі шчаслівы, што ўдзельнічаю ў свабодных выбарах. З радасцю аддаю свой голас за лепшых сыноў савецкага народа.

Падлік працягваецца. Вялікія і радасныя вынікі!

В. Стальноў.



На здымку: мітынг у Н-скай часці Чырвонай Арміі ў Выбаргу, прысвечаны заключэнню мірнага дагавора паміж Савецкім Саюзам і Фінляндыяй. Выступае маёр С. М. Заікін. (Фота-кліша (ТАСС)

ЗАМАЛЁЎКІ

—о—

СЯМ'Я

Электрычнасць у доме № 17 па Кастрычніцкай вуліцы загарэлася роўна ў 4 гадзіны раніцы. Усе лямпы ўключыў „дзяжурны" Зелік. А роўна праз поўгадзіны ўся сям'я ў саставе: бацькі — Біркера Гдаля Шмуйлавіча, маці — Хад Хацкелеўны, двух дачок — Сары і Соні і сына Зеліка, узяўшы адзін другога пад руку, накіравалася на ўчастак № 34.

На тратуары было слізка.

— Дзеці мае, толькі не падаць, — папярэджвае Гдаль Шмуйлавіч.

— Хутчэй! Ах, як мы марудна ідзем...— непакоілася больш за ўсіх 18-гадовая Соня.

Але вось і ўчастак.

— Першыя! Першыя! — наперабой загаварылі Соня і Сара.

Гдаль усміхнуўся.

— Гм, а вы думалі, што хто-небудзь апярэдзіць Біркераў?

У 6 гадзін старшыня камісіі абвясціў пачатак галасавання. Першыя бюлетэні атрымлівае рабочы-будаўнік Біркер Гдаль Шмуйлавіч, а за ім астатнія чатыры члены сям'і.

Дружная сям'я накіроўваецца ў пакой кабін.

Калі Гдаль Шмуйлавіч апускае бюлетэні ў урну, ён гаворыць, звяртаючыся да сям'і:

— Цяжка было Біркеру. Лёгка і радасна яму зараз. Прагаласуем-жа, дзеці мае, за наша новае жыццё, за нашага Сталіна!

Калі сям'я вышла на вуліцу, дзеці віншавалі бацькоў, а бацькі дзяцей.

БАБУЛЬКА

Калі агітатары ў апошні раз абыходзілі кватэры выбаршчыкаў, яны адзначылі ў сваёй запісной кніжцы, што за 76-гадовай бабулькай Радзюк Марыяй Андрэеўнай трэба будзе падаслаць машыну. Але дарэмна. Роўна а палове шостай Марыя Андрэеўна была на ўчастку № 32.

— Памаладзела, сынкі, падужэла, — гаворыць яна жартуючы. — Бачыце, на якім кані прыехала...

І яна паказвае на свой кіёк.

Хаця Марыя Андрэеўна прышла на ўчастак і не першай, але старшыня ўчастковай камісіі Гарын Владзімір Захаравіч уручае ёй, як самай старэйшай з прысутных, першыя бюлетэні.

Дзяжурныя ўказваюць Марыі Андрэеўне на кабіну, але яна з горда ўзнятай галавой накіроўваецца прама да урны.

— Я добра ведаю сваіх кандыдатаў. Я даўно ўжо ўсё прадумала і рашыла.

Дзяжурны беражліва бярэ бабульку пад руку і праводзіць — выхаду.

ЮНАК

Мн... не спалася ў гэту ноч. А... асабліва нецярпліва чакалі гадзін юнакі і дзяўчаты, ... упершыню вялікай Сталін... й Канстытуцыяй прадастаўл...ы правы роўнапраўнага грмадзяніна.

Курсат-тэлеграфіст Лапінскі Владімір Максімавіч прышоў на астак у 2 гадзіны 10 мінут ночы.

Лапінскага сустрэла давераная тав. Анціпіна:

— Чаму вы так рана, тав. Лапінскі?

— Еўдакія Іванаўна, не магу! Зразумейце мяне — не магу спаць! Як толькі закрыю вочы, мне здаецца што ўжо адчыніліся дзверы ўчастка і пачалося галасаванне. А я-ж цвёрда рашыў прагаласаваць першым.. Я першым аддам свой голас за лепшых сыноў народа, за таго, хто адчыніў перада мною шырокія перспектывы і шчаслівае жыццё, за нашага Сталіна.

Не ганіце мяне, Еўдакія Іванаўна. Я лепш тут пачакаю.

Т. Лясовіч.

г. Беласток, чыгуначная выбарчая акруга.

НАРОДНАЕ СВЯТА

Яшчэ за некалькі дзён да гістарычнага дня выбараў Беласток пачаў апранацца ў святочнае ўбранне. А на пярэдадні 24 сакавіка ён ужо быў у поўнай сваёй красе. На дамах і памяшканнях устаноў расклеены красачныя плакаты. У электрычным асвятленні гараць перадвыбарчыя лозунгі. Развяваюцца сцягі. На франтонах дамоў — транспаранты, вялікія партрэты правадыроў партыі і ўрада. Ноччу ярка загарэліся агні ілюмінацыі.

Кладучыся спаць, маляр Іван Паўлавіч Шохін загадаў сваёй дачцы Тамары завесці будзільнік на 2 гадзіны. Недарма ён адзін з першых з усёй сваёй сям'ёй — жонкай і трыма дочкамі прышоў на выбарчы ўчастак № 80. Праўда, самай меншай—Тамары да 18 год не хапае яшчэ трох месяцаў, але так ужо заведзена: на вялікія народныя святы ідуць усе — ад старога да малога. Тамара вельмі моцна хацела вучыцца і атрымаць спецыяльнасць урача. Але з чацвёртага класа яна вымушана была пакінуць школу і ісці зарабляць сабе на хлеб. Сталую-ж працу яна атрымала толькі з прыходам савецкай улады. Тамара марыць прадоўжыць вучобу і паступіць у медыцынскі інстытут.

Малапісьменнымі асталіся і старэйшыя дочкі тав. Шохіна. Дзе яму было вучыць іх, калі ён не быў польскім падданым. Такія людзі былі на асобым учоце ў паліцэйскіх. Не раз польскія сатрапы ўгаварвалі Шохіна прыняць польскае падданства, пагражалі карай, але ён не згаджаўся. Ён чакаў і жыў надзеяй, што будзе савецкім грамадзянінам. Пры атрыманні бюлетэняў ён з гордасцю дастаў свой новенькі пашпарт і заявіў:

— Мара мая збылася. Зараз я грамадзянін магутнай краіны соцыялізма. Мая сям'я будзе галасаваць за таго, хто прынёс нам свабоду, за Сталіна, за савецкую ўладу, за народных кандыдатаў.

Вось прастарэлая выбаршчыца Хасоўская. На ўчастак яе прывезлі на аўтамашыне. У сваім жыцці тав. Хасоўская галасавала два разы: сёння і ў час выбараў Народнага Сабрання.

—Не жадаю, не жадаю дамоў, мне тут так хораша, — наадрэз заявіла трохгадовая Лырыса сваёй маці, Котавай Еўфрасінні, якая пасля галасавання і прагляду канцэрта прышла забраць дачку дамоў. І сапраўды, у дзіцячых пакоях, якія былі арганізаваны на многіх участках горада, дзеці адчувалі сябе нядрэнна. Тут былі вялікія драўляныя коні, мішурныя мядзведзі, розныя цацкі.

Выбарчы ўчастак № 45. Сталы пакрыты беласнежнымі абрусамі, на якіх стаяць жывыя кветкі. Усё гэта прынеслі самі выбаршчыцы. Групамі, па пары і ў адзіночку на ўчастак сцякаюцца выбаршчыкі. Вось арганізавана, са сваімі музыкальнымі інструментамі, заходзіць група ў 40 выбаршчыкаў — удзельнікі беластоцкага ансамбля беларускай песні і пляскі. Яны ўсе жывуць у адным доме па Чырвонаармейскай вуліцы.

Прагаласаваўшы, яны ў вялікім зале—пакоі адпачынку — дэманструюць сваё выступленне. Выконваюць рускія, беларускія народныя песні і танцы, мантаж з песень савецкіх кампазітараў. Затым пачаліся масавыя гульні і танцы. Моладзь і старыкі закружыліся ў карагодзе. Паісціне гэта вялікае народнае свята.

Г. Лукслоў

НАЙВЯЛІКШАЯ ЎРАЧЫСТАСЦЬ

Участак № 32 размясціўся ў клубе чыгуначнікаў. Ноч з 23 на 24 сакавіка члены камісіі праводзілі на ўчастку. Яны яшчэ раз праверылі гатоўнасць участка да сустрэчы дарагіх гасцей.

Рана пачалі прыходзіць выбаршчыкі. У ліку першых з'явіліся на ўчастак у тры гадзіны раніцы работнік Упраўлення чыгункі Васілій Паўлавіч Гунько і рабочы 2-га тэкстыльнага камбіната Владзімір Андрэевіч Дрэноўскі.

Роўна ў 6 гадзін раніцы старшыня ўчастковай камісіі Владзімір Захаравіч Гарын абвяшчае пачатак выбараў і запрашае выбаршчыкаў прыступіць да галасавання. Чотка і хутка працуе камісія.

Адзін за другім да стала падыходзяць выбаршчыкі.

— Ваша прозвішча?

— Кавальчук Антаніна Аўгустаўна, 1872 года нараджэння.

— Прама з касцёла? — жартуе намеснік старшыні тав. Куксёнак.

— А я ў касцёл не хаджу. Што вы! — адмахваецца бабулька.

— Прад'явіце, калі ласка, пасведчанне асобы.

Бабулька, не спяшаючыся дастае савецкі пашпарт, зусім нядаўна атрыманы.

— Вось ён! — бабулька горда падае пашпарт камісіі.

Бюлетэні атрыманы. Беражліва нясе іх Антаніна Аўгустаўна ў суседні пакой. Вочы яе зіхацяць, плечы выпрастаны, паходка ўпэўненая...

У другім пакоі прыгожа афармлены кабіны і дзве вялікія урны.

Выбаршчыкі апушчаюць бюлетэні. Яны галасуюць за сваё новае жыццё, за шчасце і радасць вызваленых грамадзян, за партыю большэвікоў, за вялікага Сталіна.

Прагаласаваўшыя не хочуць выхадзіць. Побач у клубе іграе духавы аркестр. Там танцуе моладзь. Выдатна абсталяван дзіцячы пакой. На раскошным каўры, што разаслан на падлозе, мноства дзіцячых цацак. У белых, як снег, халатах, дзяжураць медыцынскія сёстры.

Незвычайная ўрачыстасць пануе на ўчастку. Міжвольна адчуваеш трапятанне ў сэрцы, калі заходзіш у гэты ўпрыгожаны будынак.

Людзі ідуць у святочным адзенні, з радаснымі, вясёлымі тварамі, з упэўненасцю гаспадара. Яны выконваюць свой свяшчэнны грамадзянскі доўг.

6 гадзін 25 мінут. Прагаласавала 48 чалавек. Праз дзве гадзіны лік прагаласаваўшых дасягнуў 150 чалавек. Паток выбаршчыкаў павялічваецца. З 12 гадзін ён прымае найбольшы размах. У дзве гадзіны дня на ўчастку прагаласавала 786 выбаршчыкаў. Члены камісіі на машынах аб'ехалі з урнамі хворых, прывезлі на ўчастак старых.

Участак № 32 адным з першых па чыгуначнай выбарчай акрузе закончыў галасаванне.

А. Тэлес.

ДЗЕНЬ ВЫБАРАЎ ПА ГАРАДАХ І ВЁСКАХ НАШАЙ ВОБЛАСЦІ

ГЭТЫ ДЗЕНЬ УВОЙДЗЕ Ў ГІСТОРЫЮ

ГРОДНА. (Па тэлефону). Святочна і ўрачыста пачаўся дзень выбараў у горадзе Гродна. Яшчэ 5 гадзін раніцы, а на вуліцах небывалае ажыўленне. Чуюцца размовы, песні, радасць і весялле. Групамі і па адзіночцы ідуць выбаршчыкі да выбарчых участкаў.

У цэнтр горада, да памяшкання 8-га ўчастка, упрыгожанага чырвонымі сцягамі і лозунгамі, бесперапынным патокам ідуць выбаршчыкі. Да пачатку галасавання яшчэ 30 мінут, а ў зале чакання ўжо сабралося 70 чалавек. Пачынаецца шчырая гутарка. Кожны імкнецца падзяліцца пачуццямі і думкамі, з якімі ён сустрэў усенароднае свята.

Уважліва слухаюць прысутныя члена арцелі шапачнікаў Эльяо Пасманік. За яго плячыма 40-гадовы вытворчы стаж. Ён успамінае дні катаржнага жыцця працоўных пры польскіх уладах. Усё гэта перажыта. Усё гэта адышло ў мінулае. Зараз шапачнік Пасманік поўнапраўны грамадзянін краіны Советаў. Зараз ён прышоў, каб першым аддаць свой голас за партыю большэвікоў, за свае шчаслівае сёння і заўтра.

Крэмлёўскі гадзіннік адбіў 6 гадзін. Шырока расчыніліся дзверы ўчастка. Пачалося галасаванне. Пачалося ўсесагульнае лікаванне вызваленага народа. Да урны адзін за другім падыходзяць радасныя, шчаслівыя грамадзяне. Яны з вялікай любоўю апушчаюць свае бюлетэні ў урны.

Першым на ўчастку прагаласаваў былы палітзняволены Іван Іванавіч Стэрнецкі. Насля гэтага ён заявіў:

— З іменем таварыша Сталіна на вустах працоўныя горада Гродна сустрэлі сёнешнюю раніцу. Сёння, у дзень усенароднай урачыстасці, мы дэманструем свае маральна-палітычнае адзінства, сваю згуртаванасць вакол партыі большэвікоў.

Вось у пакой для галасавання ўваходзіць выбаршчыца Вася Віктараўна Гатнер. Падыходзячы да ўрны, яна гаворыць:

— Чаго мне хавацца ў кабіну? Я-ж галасую за большэвікоў, за лепшых нашых выбраннікаў. Няхай усе знаюць і чуюць, што я свой голас аддаю радасна і ўрачыста.

Праходзіць усяго тры гадзіны, а на ўчастку прагаласавала звыш 400 выбаршчыкаў. Да 8 гадзін вечара ўчастковая выбарчая камісія перадала апошнюю зводку аб тым, што тут 100 процантаў выбаршчыкаў з'явілася на ўчастак і прыняла ўдзел у галасаванні. У гэты час у акруговых камісіях горада таких паведамленняў было нямала. К гэтаму часу закончылася 100-процантнае галасаванне на 7, 11 і іншых участках.

12 гадзін ночы. Скончылася галасаванне, пачаўся падлік галасоў. У 3 гадзіны раніцы 8 выбарчая камісія паведаміла, што пры стопроцантнай яўцы выбаршчыкаў на ўчастак за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных аддалі свае галасы 99,96 процанта ўсіх прыняўшых удзел у галасаванні.

Народ галасаваў за людзей, якія апраўдаюць давер'е сваіх выбаршчыкаў.

В. Гарбанёў.

ЗА КАНДЫДАТАЎ СТАЛІНСКАГА БЛОКА

Святочным убраннем красуе горад Васількова. Усюды лозунгі, плакаты, партрэты правадыроў партыі і ўрада, чырвоныя сцягі. На вуліцах многалюдна. Адусюль нясуцца песні, песні.

Выбарчы ўчастак № 99 перапоўнен народам. Да 12 гадзін дня 510 выбаршчыкаў выканалі свой свяшчэнны доўг.

Да стала сакратара падыходзіць Е. Д. Радзішэўская — жонка рабочага цукернай фабрыкі. На вясёлым твары яе заметна хваляванне. Прагаласаваўшы, Радзішэўская зварачваецца да старшыні участковай выбарчай камісіі тав. Шпакоўскага.

— Мой муж хворы і не можа прыйсці на ўчастак, каб аддаць свой голас за пасланцоў народа. Як быць?

Тав. Шпакоўскі супакоіў яе і прапанаваў крыху затрымацца. Праз некалькі хвілін член камісіі тав. Сохан разам з Радзішэўскай паехаў на кватэру да хворага, захваціўшы з сабой выбарчую урну.

На ўчастак заходзіць заклапочаны Р. Д. Асташэўскі. Ён напярэдадні выбараў прыехаў у Васількова, паступіў на работу і не мае пасведчання на права галасавання. Што рабіць? — пытае ён у членаў выбарчай камісіі. Камісія неадкладна спраўляецца па тэлефону ў тым выбарчым участку, дзе ён быў занесен у спіскі, і прадастаўляе тав Асташэўскаму магчымасць прыняць удзел у галасаванні. З вялікай радасцю атрымлівае ён бюлетэні і апускае іх у урну.

Ад урны да выхаду накіроўваецца старуха І. Жукоўская. Ёй прапануюць падводу, але яна не згаджаецца, заявіўшы:

— У такі дзень не цяжка і пайсці.

Падыходзячы да урны, кадравы рабочы 8-га тэкстыльнага камбіната тав. Дабравольскі гаворыць:

— Кандыдаты, якія ў маіх бюлетэнях, верныя сыны народа. Я з ахвотай аддаю ім свой голас. Спадзяюся, што яны з дастоінствам і чэсцю апраўдаюць наша давер'е.

Людскі паток на ўчастак скончыўся да 10 гадзін вечара. 1.333 чалавекі прынялі ўдзел у галасаванні, што складае 100 процантаў усёй наяўнасці выбаршчыкаў.

12 гадзін ночы. Старшыня выбарчай камісіі тав. Шпакоўскі аб'яўляе выбары закончанымі. Камісія прыступае да падліку галасоў.

Паспяхова прайшлі выбары і на 98 выбарчым участку Васількова. 100 проц. выбаршчыкаў прынялі ўдзел у галасаванні.

Стопроцантны ўдзел у галасаванні прынялі выбаршчыкі Студзенскага выбарчага участка № 104.

Выбаршчыкі горада Васількова прадэманстравалі любоў і адданасць сваёй соцыялістычнай радзіме і вялікай партыі Леніна—Сталіна.

Д. Казлоў.

Вялікая актыўнасць выбаршчыкаў

Ломжа. (Па тэлефону). Будынкі апрануты чырвонымі сцягамі і палотнішчамі. Лозунгі і плакаты заклікаюць: усе на выбары ў Вярхоўныя Советы СССР і БССР!

Да пачатку выбараў асталося поўгадзіны. Але на 3-і выбарчы ўчастак вёскі Купіскі з акольных вёсак прыехалі 23 выбаршчыкі, каб выканаць свой грамадзянскі абавязак. Большасць з іх жанчыны.

У 6 гадзін раніцы старшыня ўчастковай камісіі тав. Ляшкоў абвяшчае аб пачатку выбараў. Першым бюлетэні апушчае выбаршчык вёскі Монтвіцы Іосіф Ясенкоўскі, які гаворыць:

— Галасую за наша вялікае шчасце, за краіну Советаў.

К 12 гадзінам дня прагаласавала 70 процантаў усіх выбаршчыкаў. Асабліва высока актыўнасць жанчын, якія ў абсалютнай большасці прагаласавалі да 12 гадзін дня.

Фларына Есенкоўская падзялілася сваімі ўражаннямі:

— Пры ўладзе памешчыкаў і капіталістаў,—гаворыць яна,— жылося вельмі цяжка. Зараз жыццё стала вольна. Галасавала я за гэта жыццё, за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Высока была актыўнасць выбаршчыкаў у горадзе. На 2-м участку да 12 гадзін ночы прагаласавала 100 процантаў выбаршчыкаў.

Сталінскі блок комуністаў і беспартыйных атрымаў яшчэ адну бліскучую перамогу. Працоўныя Ломжаўскага раёна аддалі свае галасы за комуністычную партыю, за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Г. Кузняцоў.

ГОРДАСЦЬ І РАДАСЦЬ ЗА ЛЮБІМУЮ РАДЗІМУ

Валкавыск. (Па тэлефону). **Рассвет яшчэ не наступіў, а на вуліцах горада Валкавыска ўжо адчуваецца наступленне вялікага святочнага дня. То тут, то там пачынае гучаць вясёлая, бадзёрая песня, пераклікаюцца гармонікі. Сотні людзей спяшаюцца першымі прыйсці на выбарчы ўчастак.**

Перад уваходам у 4 выбарчы ўчастак устанаўліваецца чарга. Усе хвалююцца, зайздросцяць тым, хто стаіць наперадзе.

5 гадзін 45 мінут. Да памяшкання выбарчага ўчастка арганізавана падышла група выбаршчыкаў — 150 чалавек— з гармонікам і песнямі. Яны неслі партрэты кіраўнікоў партыі і ўрада, партрэты любімага Сталіна, партрэты кандыдатаў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР т.т. Прытыцкага, Саўко і Крука.

Выбаршчык Фуксман з'явіўся на ўчастак вельмі рана і думаў быць першым. Але, убачыўшы ў пакоі выбарчай камісіі людзей, усхваляваўся. Але хутка ўсё высветлілася. У пакоі былі толькі члены ўчастковай выбарчай камісіі.

6 гадзін раніцы. Старшыня выбарчай камісіі тав. Дзенісевіч запрашае выбаршчыкаў прыступіць да галасавання.

Выбары пачаліся.

У кінотэатр, дзе знаходзіцца 6 выбарчы ўчастак, многа выбаршчыкаў таксама з'явілася да 6 гадзін. У чаканні пачатку выбараў людзі гавораць аб сабе, дзеляцца раднасными думамі.

— Мне, — гаворыць Лейба Кват, — споўнілася 18 год. Я перажываю сёння вялікую радасць і гордасць за сябе, за ўвесь вызвалены народ. Мой голас я аддаю партыі Леніна—Сталіна.

Трэці выбарчы ўчастак. Выбаршчыца з Кароткай вуліцы Марыя Коўш прышла сюды ў пяць гадзін. Пры ўладзе капіталістаў у былой панскай Польшчы яе за чалавека не лічылі. Нідзе не прымалі яе на работу. Два года была яна беспрацоўнай, галадала з малым дзіцём. Советская ўлада дала ёй работу.

— Мне цяпер, — гаворыць з радасцю Марыя, — не страшны заўтрашні дзень. Советская ўлада дала работу, дала мне шчасце. Я сёння галасую за советскую ўладу.

Атрымаўшы бюлетэні 66-гадовы стары Хаім Штэйнвакс. Ён з хваляваннем расказвае:

— 66 год я пражыў, але такога радаснага дня ў маім жыцці не было. Гэта было не жыццё, а мучэнне. Жыццё ў мяне сапраўднае пачалося з таго часу, як над нашай зямлёй зазззялі праменні Сталінскай Канстытуцыі, як вызваліў нас вялікі Сталін. Яму я і аддаю свой голас.

...Ідзе усенароднае галасаванне. Вуліцы горада поўны людзьмі. Над горадам льюцца гукі музыкі і радасныя песні.

Мы ў выбарчым участку № 1. Галасуюць старыкі, старухі, моладзь, рабочыя, служачыя.

Вось заходзіць 73-гадовая выбаршчыца Александра Нікалаеўна Тарэс. Яна хвалюючыся срадае свае думкі, свае пачуцці:

— Не спалася мне сёння. Усё чакала, каб не спазніцца галасаваць.

Выходзім на цэнтральную вуліцу — Советскую. Вуліцы ўсё больш запаўняюцца народам. Людзі ішлі да выбарчых урн, ішлі радасныя, гордыя за вялікую радзіму, за партыю большэвікоў, за любімага Сталіна. Кожны быў горды свядомасцю выкананага грамадзянскага абавязка — ён аддаў свой голас за кандыдатаў Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Да 10 гадзін вечара па гораду прагаласавала 99 процантаў выбаршчыкаў.

Г. Майскі.

У КАЛГАСЕ ІМЕНІ СТАЛІНА

Кумач і кветкі, прыгожыя шпалеры і плакаты, лозунгі і партрэты правадыроў упрыгожваюць абшырны дом у цэнтры вёскі Новая Воля. Па высокім ганку адзін за другім узнімаюцца сяляне, пачціва знімаючы на парозе шапкі, вітаючыся з выбарчай камісіяй. Тут выбарчы ўчастак № 7 Міхайлаўскай выбарчай акругі. Сяляне вёсак Новая Воля, Планты, Баршчэва, Юльянка, Глыбокі Кут, Азяблы, Курылы і Геранімава — 1.023 выбаршчыкі — галасавалі на гэтым участку. Яны неслі свае галасы за таварышоў Кавалёва і Турлейскага — кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР і за сваю блізкую зямлячку, сялянку з Новай Волі, старшыню калгаса ім. Сталіна Еўдакію Фёдараўну Максімюк.

З чатырох гадзін ночы пайшлі выбаршчыкі на ўчастак. Цярпліва яны чакалі пачатку галасавання. З цікавасцю наглядалі цырамонію запячатвання выбарчых урнаў — адной вялікай і двух маленькіх, разносных. Старшыня камісіі Іосіф Сцяпанавіч Максімюк роўна ў 6 гадзін запрасіў выбаршчыкаў пачаць галасаванне. Адразу дзесятак чалавек атрымалі бюлетэні і наперабой стараліся данесці іх да урны. Пайшлі старэнькія бабулькі, якія галасуюць яшчэ першы раз у жыцці, калі не лічыць выбараў у Народнае Сабранне. Так, першы раз у жыцці. Бо яны ніколі не галасавалі на польскіх выбарах, а зараз яны кажуць:

— Цяпер нас і не ўтрымаў-бы ад галасавання, калі стала наша советская ўлада. А раней не наша была ўлада, і не наша было галасаванне за яе.

Да стала камісіі падыходзіць 58-гадовая Надзежда Міхайлаўна Сак. Яна ніколі яшчэ не галасавала да советскай улады. Яна складвае ва ўсмешку старэнькія вусны, урачыста бярэ бюлетэні і проста ідзе ў пакой, дзе стаіць урна.

— Бабуня, вы-ж у кабінку зайдзіце, — прапануе ёй член камісіі.

— Э, што я там буду рабіць! Я простай дарогай.

А вось 18-гадовы юнак Леонцій Буйко. Натоўп ля стала, а ён старанна скарэй атрымаць бюлетэні ды прагаласаваць. Яго парыванне сгрымлівае член камісіі, кажучы, што і старэйшыя таксама хочуць раней. Але затое ён абагнаў старэйшых ля урны, скарыстаўшы іх замінку, пакуль яны павольна разглядалі свае бюлетэні.

Так да поўдня ўсе выбаршчыкі Новай Волі апусцілі ў урну свае бюлетэні, за выключэннем хворых. Тады член камісіі Аляксей Осіпавіч Серада прапануе пайсці да хворых з урнамі на дом. Але ніхто не хоча ісці, каб не прапусціць падаспеўшай урачыстасці.

Тут трэба невялікае паясненне. У Новай Волі, дзе 183 двары, 160 двароў уступілі ў калгас — імені Сталіна. Старшынёй яго Еўдакія Фёдараўна Максімюк. Яна—кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР і балатуецца па гэтай акрузе. А ў суседняй вёсцы Азяблы — калгас імені Варашылава. І вось варашылаўцы былі героямі ўрачыстасці.

У канцы прамой вуліцы паказалася цікавае шэсце. Стройная калона з сцягамі і песняй ішла да ўчастка. Тады старшыня ўчастковай камісіі паклікаў яшчэ двух членаў, узяў вялікі сцяг, і ўсе ўтрох вышлі на сярэдзіну вуліцы.

— Вітаем калгас імені Варашылава! Ура, таварышы!

Дружныя галасы мужчын і жанчын прагрымелі трохразовым адказным «ура».

Зайшоўшы ў памяшканне участка, варашылаўцы радасна вітаюць сваю кандыдатку Еўдакію Максімюк, якая ў гэты час была тут.

Раптам член камісіі Серада ўстрывожана з-за стала гаворыць:

— Што гэта мы робім, таварышы! Да гэтага часу не паслалі нікога з урнамі да хворых...

Уражанне ўрачыстасці змянілася трывогай усёй камісіі. Гэта-ж, каб зранку пайсці да хворых, дык да чатырох гадзін усё галасаванне было-б закончана. Адразу чатыры члены камісіі з двума урнамі адпраўляюцца ў вёскі на конях, і да поўгадзіны шостай прысылалі назад.

Старшыня камісіі паспешліва піша рапарт у акруговую камісію:

«Па 7 выбарчаму участку на 6 гадзін вечара прагаласавала 1.023 чалавекі. Выбыў з участка 21 выбаршчык. Усяго па спісу значыцца 1.044 выбаршчыкі. Такім чынам галасаванне ахапіла 100 процантаў».

З дасадай члены камісіі слухалі вестку, што суседні ўчастак яшчэ ў гэтыя гадзіны закончыў галасаванне першым па акрузе.

А праз вуліцу ў школе ішло ўжо вясёлае гулянне.

І. Клінаў.

Поўны радасці дзень

Заблудава. (Па тэлефону). **Гарадок апрануўся ў святочнае ўбранне. Сцягамі, плакатамі, партрэтамі правадыроў партыі і ўрада ўпрыгожаны вуліцы і дамы. У цэнтры плошчы вісяць вялікія партрэты любімага Сталіна і Молатава. У клубах, на выбарчых участках, у дамах — усюды пануе небывалае ажыўленне. Многія не спалі ў гэту ноч.**

Узнімаецца хвалюючы, поўны радасці дзень. Ужо з чатырох гадзін раніцы горад не спіць. Па вуліцах спяшаючыся ідуць выбаршчыкі. На першым выбарчым участку сабралося больш 25 чалавек, а да пачатку галасавання яшчэ паўтары гадзіны.

Надыходзіць доўгачаканы час. Старшыня выбарчага ўчастка тав. Рохкін віншуе выбаршчыкаў з вялікім святам—днём выбараў і просіць прыступіць да галасавання.

Першым падыходзіць да урны выбаршчык Зельман Далінскі. Ён, стары рабочы, лічыць вялікай часцю галасаваць першым. Далінскаму ўжо 64 годы, з іх 42 ён працуе на скурзаводзе. Ён прышоў на ўчастак разам з жонкай Песяй і дачкой Хомай, каб аддаць свае галасы за кандыдатаў вызваленага народа.

Хвалюючыся, падыходзіць да урны рабочы Сімбірскі. 27 год ён гнуў сваю спіну на эксплататараў-фабрыкантаў. Рабочыя скурзавода № 11 яго, як лепшага, адданага старога рабочага, выбралі старшынёй заўкома. Тут побач з ім стаіць яго дачка Шоша, якая ўпершыню ў сваім жыцці галасуе. Ёй толькі 2 сакавіка споўнілася 18 год.

Адным з першых галасуе выбаршчык Качук. Яму 68 год. Качук патомственны рабочы. Ён многа перажыў нягод. Апускаючы бюлетэні, ён ад усяго сэрца заявіў:

— Якая радасць для мяне і маёй жонкі. Сёння мы свабодна ўдзельнічаем у такой вялікай дзяржаўнай справе, галасуем за лепшых людзей народа. Наша жыццё толькі пачалося. І кожны чалавек, кожны грамадзянін будзе галасаваць за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных.

Да выбарчага ўчастка стройнымі радамі, са сцягамі і партрэтамі кіраўнікоў партыі і ўрада падыходзіць калона. Больш 200 рабочых скурзаводаў № 11 і 13 арганізавана прышлі галасаваць. На вуліцы стыхійна ўзнікае мітынг, выступаюць рабочыя і служачыя. Па вуліцы нясуцца воклічы ў чэсць любімага Сталіна і яго саратнікаў, у чэсць доблеснай Чырвонай Арміі.

За першыя дзве гадзіны на гэтым участку прагаласавала больш 400 чалавек, а к тром гадзінам дня — 1.200 з агульнай колькасці выбаршчыкаў 1250.

* *
*

Выключна арганізавана прайшлі выбары ў Заблудаўскім раёне. Ужо к 4 гадзінам дня на Гарадокскім і 2 Заблудаўскім выбарчых участках прагаласавалі ўсе выбаршчыкі. Да 7 гадзін вечара на 8-мі участках закончылася галасаванне.

М. Шаховіч

УСЯ МАСА ВЫБАРШЧЫКАЎ ПРЫШЛА НА ЎЧАСТКІ

Саколка. (Па тэлефону). **Горад яшчэ быў апранут прадрассветнай імглой, але людзі ўжо даўно не спалі. Групамі і па асобку выбаршчыкі ішлі да выбарчых участкаў. Ля дзвярэй участка № 94 к гадзіне ночы стаяла ўжо каля двух дзесяткаў людзей.**

Першым галасаваў стары рабочы скурзавода Берка Мееравіч Ладундзік. Выканаўшы свой грамадзянскі абавязак, тав. Ладундзік заявіў:

— Я не спаў усю ноч, каб першым аддаць свой голас за дэпутатаў сталінскага блока, за нашу партыю і яе правадыра таварыша Сталіна.

У 7 гадзін раніцы да выбарчага ўчастка падышла калона рабочых скурзавода, абутковай і кравецкай арцелей — 300 чалавек. Яшчэ напярэдадні яны ўмовіліся галасаваць арганізавана. Прагаласаваўшы, рабочыя зноў пастроіліся ў калону і прайшлі па ўсяму гораду.

Да 10 гадзін раніцы ў асноўным галасавалі старыкі. На выбарчы ўчастак прышоў 72-гадовы Калман Моўшавіч Друк. Усё сваё жыццё ён працаваў грузчыкам. Цяжкая праца за доўгія годы адняла яго здароўе. Да прыходу сюды Чырвонай Арміі ніхто не клапаціўся аб адзінокім старыку, які страціў працаздольнасць, а з ёй і сродкі да існавання. Толькі напярэдадні выбараў тав. Друк пазнаў, што Сталінская Канстытуцыя ахоўвае інтарэсы працоўных, якія страцілі працаздольнасць. Вось чаму ён гаворыць:

— Я з вялікай радасцю аддаю свой голас у ліку першых за нашых кандыдатаў, вылучаных народам.

Добра была арганізавана сустрэча выбаршчыкаў на выбарчым участку № 90. У гарадскім клубе, дзе змясцілася ўчастковая камісія, з самай раніцы іграў духавы аркестр, працаваў буфет. Увесь дзень у клубе было поўна народу. Прагаласаваўшы, выбаршчыкі доўга не жадалі разыходзіцца.

За дзве гадзіны да пачатку галасавання з'явіліся на 91-шы выбарчы ўчастак 50-гадовы рабочы скурзавода Пятроў і старшы рабочы — чыгуначнік ст. Саколкі Хачынскі.

К 10 гадзінам вечара галасаванне ў горадзе ў асноўным было закончана.

Не менш арганізавана прайшло выбары ў вёсках Саколкаўскага раёна. Выбаршчыкі вёсак Верхлес і Сакольда поўнасцю кончылі галасаванне к 6 гадзінам вечара.

На Шудзялаўскім і Астраўпаўночным выбарчых участках к гэтаму часу прагаласавала 99 процантаў усіх выбаршчыкаў.

Л. Федасенка.

ЗА РУБЯЖОМ

АМЕРЫКАНСКІ ДРУК АБ МАГУТНАСЦІ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Буржуазныя карэспандэнты, якія на працягу апошніх тыдняў давалі хлуслівыя паведамленні аб Чырвонай Арміі і апісвалі выдуманыя „перамогі“ белафінаў, зараз вымушаны біць адбой. Каб адназначна пахіснуты пэўстыж друку, многія карэспандэнты зараз асабіста прызнаюць свае „памылкі“, прабуючы знайсці для іх розныя апраўданні.

Т. к., напрыклад, карэспандэнт газеты „Нью-Йорк пост“ заявіў, што амерыканскія карэспандэнты не здолелі вызначыць сілу і магутнасць Чырвонай Арміі, паколькі белафіны не давалі ім наведаць фронт (Замест гэтага карэспандэнты праседжвалі цэлыя дні ў кафэ ў Хельсінкі, атрымліваючы „інфармацыю“ ад мангергеймаўскіх агентаў). Карэспандэнты выявілі, што яны з'явіліся афярамі сваёй уласнай хлусні. Карэспандэнт газеты „Чыкага дэйлі ньюс“ Стоу ў пакаянным артыкуле, надрукаваным у гэтай газеце 20 сакавіка, піша, што „на працягу многіх год руская транспартная сістэма апісвалася як сур'ёзна дэзарганізаваная“. Таму карэспандэнты верылі замежным ваенным аташэ ў Фінляндыі, якія сцвярджалі, што Чырвоная Армія не зможа працягваць наступленне на Карэльскім перашыйку, паколькі снабжэнне арміі ва ўмовах суровай зімы прадстаўляе сабой амаль невырашымую праблему.

„У сярэдніх чыслах лютага,— працягвае Стоу, — замежныя ваенныя эксперты сцвярджалі, што Чырвоная Армія змажа працягваць сваё наступленне не больш 10 дзён, тым не менш на ўсіх франтах чырвоныя дывізіі прадаўжалі весці наступленне без перадышкі“.

Не гледзячы на заяўленні „замежных ваенных экспертаў“ і апісанні карэспандэнтамі штодзённых „перамог“ Манергейма, карэспандэнт газеты „Нью-Йорк пост“ прызнае, што „гэта вайна даказала боездольнасць і храбрасць Чырвонай Арміі. Замежныя ваенныя эксперты і дыпламаты прызнаюць гэты важнейшы ўрок фінскага канфлікта, і гэта аказвае ўплыў на палітыку заходніх ваюючых краін, а таксама і на будучае развіццё падзей у Еўропе“.

„Карэспандэнт газеты „Нью-Йорк геральд трыбюн“ Кер прызнае, што замежныя карэспандэнты нагла хлусілі, абвінавачваючы савецкую авіяцыю ў нападах на грамадзянскае насельніцтва. Кер заяўляе, што ніколі за ўвесь час савецка—фінляндскага канфлікта савецкая авіяцыя не вяла паветранай вайны супроць грамадзянскага насельніцтва.

Амерыканскі журнал „Тайм“ піша, што савецка-фінляндскі канфлікт з'яўляецца вельмі знамянальным у тых адносінах, што Чырвоная Армія разбурыла лінію манергеймаўскіх умацаванняў, якія да гэтага часу лічыліся неўразвімымі. Журнал таксама адзначае, што замежныя карэспандэнты, якія ўсё яшчэ знаходзіліся пад уражаннем сваіх уласных паведамленняў аб перамогах белафінаў, былі здзіўлены, пачуўшы ў Хельсінкі паведамленні берлінскага радыё аб заключэнні міру.

Супярэчлівыя каментарыі змяшчае штотыднёвік „Ньюс уік“. Прызнаваючы гаворыць аб тым, што Манергейм „непераможан“, штотыднёвік у той жа час заяўляе, што Чырвоная Армія забяспечыла ўсе свае непасрэдныя ваенныя задачы— бяспеку Ленінграда, Фінскага заліва і Мурманскай чыгункі. Далей штотыднёвік піша, што поспехі Чырвонай Арміі нанеслі другі ўдар англа-французскім імперыялістам, якія як з маральнага, так і з стратэгічнага пункта погляду былі вельмі зацікаўлены ў працягванні вайны ў Фінляндыі. Таму правіўшы тыдзень прынёс многа змрочных дзён для Англіі і Францыі, азнаменаваўшы крушэнне іх планаў. „Ньюс уік“ указвае, што поспехі Чырвонай Арміі аслабілі ўплыў французскай дыпламатыі ва ўсім свеце, асабліва сярод малых нейтральных краін. „У той-жа час,— піша ў заключэнне штотыднёвік, — гэтыя поспехі аслабілі ўпэўненасць грамадскасці ўнутры Францыі і Англіі адносна здольнасці іх урадаў весці вайну“.

Фальсіфікацыя падзей у Фінляндыі буржуазнымі карэспандэнтамі яшчэ больш аслабіла веру шырокіх кругоў чытачоў у капіталістычны друк.

(ТАСС).

МАГЧЫМЫЯ ЗМЯНЕННІ Ў СКЛАДЗЕ АНГЛІЙСКАГА ЎРАДА

ЛОНДАН, 24 сакавіка (ТАСС). Палітычныя кругі абмяркоўваюць магчымыя змяненні ў складзе англійскага ўрада. Перад роспускам парламента на велікодныя канікулы ў кулуарах парламента ўказвалася на неабходнасць не толькі змяніць склад урада, але і стварыць меншы, але больш эфектыўны ваенны кабінет. Па заяве газеты „Обсервер“, асаблівай крытыцы падвергся міністр авіяцыі Інгсэл Уд, міністр гандлёвага суднаходства Гільмур, міністр харчовага снабжэння Морысон, кіраўнік дэпартамента горнай прамысловасці Лойд і міністр транспарта Уолес. Некаторыя кругі прадказвалі, што Чэмберлен зноў зробіць прапанову лейбарысцкай і ліберальнай партыям прыняць удзел у ваенным кабінеце. Палітычныя аглядальнікі большасці нядзельных газет чакаюць, што на працягу велікодных канікул або скора пасля іх Чэмберлен прыме рашэнне аб змяненні складу ўрада.

НА ЗАХОДНІМ ФРОНЦЕ

ПАРЫЖ, 25 сакавіка. (ТАСС) Французскае камюніке ад ваенных дзеянняў, апублікованае 24 сакавіка ўвечары, адзначае, што на фронце „нічога не адбылося“.

У ранішнім камюніке за 25 сакавіка сказана, што „ноч прайшла спакойна. За дзень 24 сакавіка ў выніку мясцовых стычак захвачана некалькі палонных“.

БЕРЛІН, 25 сакавіка. (ТАСС). У зводцы, апублікаванай вярхоўным камандаваннем германскай арміі, гаворыцца:

„На заходнім фронце мясцовая артылерыйская і разведчая дзейнасць. У ноч на 25 сакавіка многалікія непрыяцельскія самалёты лёталі над Паўночна-Заходняй Германіяй і ў раёне Мозеля і Рэйна. Германская зенітная артылерыя збіла адзін самалёт Вікерс „Велінгтон“. На зваротным шляху непрыяцельскія самалёты нарушылі галандскую граніцу“.

ПАРЫЖ 25 сакавіка (ТАСС). Агенцтва Гавас паведамляе, што 24 сакавіка на фронце ўздоўж Рэйна немцы скінулі з самалёта вялікую колькасць лістовак і газет. У адказ французы адкрылі агонь з аўтаматычнай зброі. Завязалася ажыўленая перастрэлка цераз Рэйн. У астатнім дзень прайшоў спакойна.

ГЕРМАНА-РУМЫНСКІЯ АДНОСІНЫ

БЕРЛІН, 24 сакавіка. (ТАСС). Днямі агенцтва Рэйтэр, а таксама англійскія і французскія газеты распаўсюдзілі паведамленне аб тым, што Германія прад'явіла Румыніі ноту ультыматыўнага характару, у якой яна патрабавала павелічэння румынскіх паставак нафты, зніжэння экспартных тарыфаў і ўстанаўлення новага курса маркі ў адносінах да румынскай леі. 23 сакавіка румынскае агенцтва Радор рашуча абвергла гэтыя паведамленні. Германскае інфармацыйнае бюро з свайго боку таксама абвергла гэтыя паведамленні.

24 сакавіка германскае інфармацыйнае бюро перадае: „Як ужо вядома, агенцтва Рэйтэр распаўсюдзіла паведамленне аб тым, быццам Германія прад'явіла ультыматум Румыніі. Адпаведнымі румынскімі органамі гэта паведамленне было кваліфікавана як хлуслівае. Міністр прапаганды Джыурэску запрасіў 23 сакавіка некалькі прадстаўнікоў замежнага друку ў Бухарэсце і рэкамендаваў ім не распаўсюджваць фантастычных чутак, якія ім самім прыдзецца зараз жа абвяргаць. Ён падкрэсліў далей, што ў праціўным выпадку румынскія ўлады будуць вымушаны зрабіць адпаведныя вывад у адносінах такіх карэспандэнтаў. Кажуць, што румынскі міністр прапаганды, даведаўшыся аб гэтых паведамленнях, якія распаўсюджваліся таксама і агенцтвам Гавас, запрасіў да сябе прадстаўнікоў абодвух агенцтваў і прапанаваў „або зараз-жа абвергнуць іх паведамленні, або ў 24 гадзіны пакінуць Румынію. Абодва палічылі за лепшае абвергнуць свае паведамленні“.

ПАРЫЖ, 24 сакавіка (ТАСС). Агенцтва Гавас паведамляе, што карэспандэнт агенцтва Рэйтэр у Бухарэсце Ловел высылаецца румынскімі ўладамі з Румыніі. Ён павінен пакінуць краіну ў 24 гадзіны.

Некаторыя падрабязнасці пасяджэння французскай палаты дэпутатаў 22 сакавіка

БРУСЕЛЬ, 23 сакавіка. (ТАСС). У журналісцкіх кругах паведамляюць некаторыя падрабязнасці аб пасяджэнні французскай палаты дэпутатаў, якое адбылося 22 сакавіка. Далад'е на пасяджэнні палаты не прысутнічаў. Адзін з статс-сакратароў—Гранмэзон—перад пасяджэннем падаў у адстаўку, бо група „Рэспубліканская федэрацыя“, членам якой ён з'яўляецца, адмовіла кабінету ў даверы. Прадстаўнікі правых у парламенце ў сваіх выступленнях патрабавалі стварэння новага ваеннага кабінета і выключэння са складу кабінета сацыялістаў. спасылаючыся пры гэтым на тое, што абстаноўка патрабуе „рашучай палітыкі“, у той час як сацыялісты заўсёды „памяркоўвалі“ сябе ў гэтым сэнсе „з нежаданага боку“. Рад правых у сваіх выступленнях дапушчалі рэзкія антысавецкія выпады. Правы Фернан-Ларан у сваім выступленні заявіў, што міністр блакады Жорж Монэ, які прымаў удзел у амстэрдамскім антываенным кангрэсе ў 1932 годзе, выступаў тады „супроць нацыянальнай абароны“. Сацыяліст Монэ ў адказ заявіў, што за восем год многае змянілася і што ў верасні 1939 года ён ахвотна уступіў у армію. Лідэр сацыялістаў Леон Блюм заявіў, што сацыялісты „аддаюць сабе справаздачу ў перажываемай абстаноўцы“ і што яны будуць „добрасумленна супрацоўнічаць з урадам“, цалкам і поўнасцю падтрымліваючы надзвычайныя правы апошняга. „Тры годы таму назад, — сказаў Блюм,— мы ўвайшлі ва ўрад Шатана і былі вернымі і лаяльнымі супрацоўнікамі яго“. Блюм патрабаваў, каб урад вёў яшчэ больш рашучую барацьбу супроць камуністаў.

КОРАТКА

Германскі пасол у Італіі Макензен выехаў у Берлін.

* * *

Часова выконваючы абавязкі прэзідэнта у Эквадары Кордова амністыраваў палітычных зняволеных, за выключэннем удзельнікаў паўстання ў Гуаякіле 12 студзеня гэтага года.

* * *

На выстаўцы новых дарожных машын у Чыкага ўвагу прыцягвае экскаватар у 22,5 метра даўжынёй і 4,5 метра вышынёй, які выконвае ў адзін прыём 55 тон зямлі. Ён дзейнічае з дапамогай дызеля ў 160 конскіх сіл, перасоўваецца дызельным трактарам у 55 конскіх сіл.

* * *

Англія скупляе на Балканах фураж, пры гэтым цана не іграе рашаючай ролі.

* * *

У Англіі рознічныя цэны на рыбу павышаны ад 20 да 40 працантаў. З пачатку вайны аптовыя цэны на харчовыя тавары павысіліся на 40 працантаў.



На здымку: Былая беластоцкая тэкстыльшчыца, якая цяпер працуе загадчыцай бюро скарг аблвыканкома, кандыдат у дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР—Марыя Іванаўна Дзячук—атрымлівае савецкі пашпарт. (Фотахроніка БЕЛТА).

ПА БЕЛАСТОКУ І ОБЛАСЦІ

ПРАВОДКА ЭЛЕКТРЫЧНАСЦІ Ў КВАТЭРЫ ПРАЦОЎНЫХ

Кожны дзень на беластоцкую гарадскую электрастанцыю паступае мноства заявак на праводку электрычнасці ў кватэры працоўных. Толькі за апошнія два месяцы электрычнае асвятленне праведзена ў 994 кватэры.

У ПЯРВІЧНЫХ АРГАНІЗАЦЫЯХ ЧЫРВОНАГА КРЫЖА

Пашыраецца сетка пярвічных арганізацый Чырвонага Крыжа г. Беластока. Ужо створана 20 пярвічных арганізацый, у якіх налічваецца 1000 чалавек. Пры гаркоме Чырвонага Крыжа арганізавана дзве санітарныя дружыны. Створаны таксама 14 гурткоў па здачы норм на значок ГСА.

Днямі пры гаркоме быў выпуск старшынь пярвічных арганізацый без адрыву ад вытворчасці. З 25 сакавіка пачынаецца другі набор на такія-ж курсы.

НА ГРОДНЕНСКАЙ АБУТКОВАЙ ФАБРЫЦЫ

Прайшло чатыры месяцы з моманту арганізацыі Гродненскай абутковай фабрыкі, але аб'ём яе работы ўдзесяцярыўся. Зараз на фабрыцы працуе звыш 150 рабочых, а ўсяго два месяцы таму назад тут было 50 чалавек.

Да канца бягучага года фабрыка павялічыць прадукцыю да 1.500 пар абутку ў дзень.

Для выканання гэтага плана фабрыка значна расшыраецца і механізіруецца. На абсталяванне цэхаў адпушчаецца 240 тысяч рублёў. У бліжэйшыя дні фабрыка атрымае рад новых машын. Арганізуюцца новыя цэхі: закройны, галантарэйны, штампавачны, мантажны і сталярны. Колькасць рабочых будзе даведзена да 500 чалавек.

ЗДАБЫЧА ВАПНЫ

Нядаўна каля горада Гродна выяўлены залежы вапны. Абласны аддзел мясцовай прамысловасці выслаў на месцанараджэння вапны спецыялістаў для арганізацыі вытворчасці вапны.

Адказны рэдактар Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА № 10

Беластоцкага гарадскога выканаўчага камітэта ад 22 сакавіка 1940 г.

Аб забароне рамонту, перапланіровак, надбудоў, асваення зямельных участкаў, а таксама будаўніцтва і разборкі жыллёвых, службовых і дваравых пабудоў без дазволу гарадскога комунальнага аддзела.

У мэтах планамернага будаўніцтва і рамонту жыллёвых і службовых пабудоў, згодна існуючых тэхнічных і процілажарных правіл, Беластоцкі гарадскі выканаўчы камітэт пастанаўляе:

1. Абавязваць усе ўстановы, прадпрыемствы, арганізацыі і ўсіх грамадзян г. Беластока, якія робяць пабудову памяшканняў, службовых і дваравых пабудоў, знос старых, капітальны рамонт, перапланіроўку, надбудову, прыбудову, а таксама асваенне межаў асвоеных зямельных участкаў — атрымаць на гэта папярэдні дазвол у Беластоцкім аддзяленні гарадской комунальнай гаспадаркі.

2. Вінаўныя ў нарушэнні гэтай абавязковай пастановы прыцягваюцца да адказнасці ў адміністрацыйным парадку — штрафу да 100 рублёў, або прымусовым работам да 15 дзён.

3. Нагляд за выкананнем данай пастановы ўскладаецца на Беластоцкі гарадскі аддзел комунальнай гаспадаркі і міліцыю.

4. Пастанова ўваходзіць у сілу праз 7 дзён пасля яе апублікавання.

Старшыня горвыканкома ГАРЭЛІК,
Адказны сакратар ОКУНЬ.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома, Тэлефоны рэдакцыі: адказнага рэдактара — 22 (па камутатару аблвыканкома) 49 (гарадскі), сакратарыята, партыйнага і савецкага аддзелаў — 23 (па камутатару аблвыканкома), прамысловага, сельскагаспадарчага, культурнага і інфармацыйнага аддзелаў — 17-62 (гарадскі). Тэлефон выдавецтва і аддзела аб'яў — 16-10. Тэлефон друкарні і начной рэдакцыі — 5-21.
Падпіску на газеты прымае „Саюздрук“ (Тэлефон 5-14).

Упаўнаважаны абліта № 423.

6-я дзяржаўная друкарня ў г. Беластоку.